№1(339) 11.01.2002 — 20.01.2002 Рэспубліканская грамадска-палітычная незалежная газета • Заснавана ў чэрвені 1994 г.

Беларуская маладзёжная

• Байки из склепа

Экзаменационное счастье — летающая табуретка...

Студенты тоже люди. И им простительно все. Особенно в сессию, которая, как правило, всегда подкрадывается незаметно (хотя видна издалека). Именно в эту пору у студентов мозги работают на все обороты, дни и ночи сплетаются воедино и жизнь наполняется сплошными комичными ситуациями. Байки о таких ситуациях расходятся народными легендами, которые всегда "в тему" расповести в любом возрасте и на любой тусовке.

Но, ломая традиции писать о студентах только в преддверии Татьяниного дня, решили мы создать целую рубрику, посвященную веселым жизненным историям. В этой рубрике будем собирать в свой "склеп" всякие-разные приколы, связанные как со сдачей экзаменов, так и с учебой вообще.

Ну а первым в гости мы пригласили актера Евгения Крыжановского, известного всей стране своим званием почетного "христофоровца".

Из известного анекдота:

Глубокая ночь. В теплой постели спит профессор. Раздается телефонный звонок. Профессор долго не подходит к телефону, потом разбуженный, жутко раздраженный, поднимает трубку:

— Степан Петрович?

— Да...

— Что, спишь, гад? А мы тут учим...

— Евгений, припомните самый незабываемый для Вас экзамен.

— Их было несколько. Весьма памятным был экзамен в Москве, в Институте кинематографии. Тогда Ирина Скобцева, жена Сергея Бондарчука, сказала, что артиста из меня никогда не получится. Я запомнил это на всю жизнь и после перестал смотреть фильмы с участием Бондарчука и Ирины Скобцевой. Хотя, я не думаю, что они от этого стали беднее или пожалели... Но так как тогда — это были 70-е годы — люди ходили в кино, чтобы посмотреть именно наши фильмы, то те 20 копеек, которые я мог отдать на кинотеатр, в их карман не попали. Так им и надо!

Второй незабываемый экзамен — поступление в Театральный институт в Беларуси. Чтобы сдавать основные экзамены, нужно было сначала пройти три профессиональных тура. Два из них я успешно прошел, а о результатах третьего можно было узнать из списков, которые вывешивали. Но к тому моменту, как я пришел смотреть эти списки, все документы еще не успели вывесить. Естественно, я не нашел там своей фамилии и подумал, что третий тур не прошел... С горя я напился и уже собрался ехать к себе домой, в Калужскую область. Но захотел в последний раз посмотреть на институт: два года поступать и не поступить — все же "круто"... И когда я зашел в институт — увидел, что к спискам прибавилась третья бумажка, где написана фамилия Крыжановский. В ту же минуту я увидел известную всему театральному миру Эмму Михайловну, которая на кафедре работала секретарем, она бежала мне навстречу, вопя: "Где вы ходите? Вас уже вся комиссия ждет!". Я бросил чемоданы, побежал, споткнулся... У меня волосы тогда были до плеч, клеш с лампочками внизу... Я так и влетел в аудиторию, и сразу начал читать Гамлета. Что было с комиссией — можно было только представить...

Ну а третий экзамен, где можно было вдоволь насмеяться — это испытания в ГАИ, когда я на права сдавал. Я умудрился тогда такой вопрос задать, что экзаменатор просто рухнул: "Вот в машине три педали. А ноги только две. Чем же на среднюю педаль нажимать?.."

— Сессии в Театральном институте тяжело сдавались?

— Надо сказать, что в Театральном учиться намного легче, чем в любом другом. Специальности там интересные сами по себе. А отношение педагогов к таким предметам, как политэкономия, научный коммунизм, французский язык, белорусская, русская литература, было... как в школе для дебильных детей. И преподаватели нас как могли жалели.

Я вот, хоть четыре года учил французский язык, знаю всего две фразы — "звонок прозвенел" и "Париж — столица Франции". Так этими двумя фразами я и сдавал экзамен — целых полчаса! Комиссия, которая сидела на экзамене, французский тоже не знала, и удивленно на меня смотрела: полчаса так красиво разговариваю... И только мой педагог — Наталья Ивановна — прекрасно понимала, что я знаю всего две фразы, и что оригинальный перевод моего ответа был приблизительно следующим: "Звенит звонок — столица Франции, столица Франции — Париж, звенит звонок, звонок — Париж... и т.д."

Еще запомнился экзамен по танцу, на который приехали какие-то коллеги из Польской Народной Республики. Их посадили на почетные места, и целый курс перед ними сдавал свой экзамен по танцу. После моего выступления они что-то сказали. Никто не понял, все умиленно заулыбались. И только потом мне перевели, что поляки назвали меня "летающая табуретка".

— Наверняка на экзаменах не обходилось без всяческих уловок. Как вы обманывали своих преподавателей?

— У нас был один преподаватель по политэкономии... Находка для студентов — у него правый глаз был стеклянный. Об этом все знали. Поэтому когда он приходил, все садились у окна с правой стороны, чтобы подсматривать. А с левой старался никто не садиться. К тому же преподаватель был еще и немного глуховат. Поэтому для обмана складывались все обстоятельства. Чтобы сдать экзамен, можно было бубнить что-нибудь невнятное, при этом громко выкрикивая имена "Ленин" и "Брежнев". Ответ представлял из себя что-то в роде: "Эмэ-мэ-мэ-мэ....э... БРЕЖНЕВ!!! Бэ-вэ-мэ-нэ....э... ЛЕНИН!!! Мэээ-мммм-нэннэ... ВОЗРОЖДЕНИЕ, ЦЕЛИНА!!!" Народ умудрялся при этом еще и в книжку подсматривать, которую, естественно, клали с правой стороны...

— Вспомните свою самую эффектную ночь перед экзаменом.

— Первый раз я женился еще учась в институте. И так совпало, что последняя ночь перед экзаменом была первой брачной ночью. Но экзамен был очень ответственным, решающим в вопросе распределения — приезжали так называемые "купцы", режиссеры, которые смотрели, отбирали, чтобы потом предложить сотрудничество. И сказать, что в свою брачную ночь я выглядел как Ален Делон или Жан Поль Бельмондо... Сейчас можно признаться: я волновался больше, куда меня распределят...

— У Вас есть формула успеха для сдачи сессий, которой Вы бы могли поделиться?

— Я знаю, что лучше всего бить преподавателей жалостью. У нас девчонки беременели по два раза за сессию. Одна моя однокурсница подкладывала себе подушку под платье с первого курса. И только на четвертом курсе до одного преподавателя, видимо, дошло, и он спросил: "Таня, а когда же вы, наконец, родите?".

Еще качественно действуют костыли. Или хороший фингал. Только не нарисованный губной помадой или тушью, а настоящий, конечно. Однажды, когда я пришел с таким эффектным фингалом, у меня спросили: "Что с вами, Крыжановский?", я начал объяснять, что, мол, девушка шла, пристали хулиганы, а я защитил...

— Вам диплом пригодился в жизни?

— Естественно. В театральном институте существует такая формула (никогда не верил, что это действительно так!): когда из 25 человек один становится Актером с большой буквы — это великолепный курс, если два человека — это замечательный курс, если три или четыре — это просто гениальный курс. Люди, конечно, могут работать в театрах, но не у всех складывается актерская карьера. Я считаю, что у меня судьба сложилась просто замечательно, иначе сейчас вы бы у меня интервью не брали. Я очень благодарен своим педагогам, которые вложили в меня столько, что я по сей день пожинаю результаты. А диплом сейчас висит у меня на стенке и подтверждает, что я профессиональный Артист. С большой буквы.

Байки собирала Людмила Шестак, для "БМ"

Папярод цягніка

Агляд заўтрашніх падзей

12 студзеня — у памяшканні Управы БНФ (вул. Варвашэні, 8) пройдзе чарговы Сойм БНФ. Пачатак а 14-й гадзіне.

17 студзеня — Таварыства беларускай мовы (вул. Румянцава, 13) праводзіць паседжанне сакратарыята. Пачатак у 17.30.

18-20 студзеня — Грамадскае аб'яднанне "Фонд імя Л.Сапегі" і IBB Дортмунд у рамках праграмы TACIS ладзяць семінар "Структура, парадак фарміравання і кампетэнтнасць мясцовых органаў улады на Беларусі і ў іншых краінах".

18 студзеня — у Рэспубліканскім Палацы ветэранаў (вул. Я.Купалы) пройдзе II Фестываль беларускай незалежнай прэсы. У межах Фестывалю адбудзецца прэзентацыя выданняў. Пачатак а 18 гадзіне.

9 лютага — у Гродна незарэгістраваная Канфедэрацыя Дзеючых Суполак "Разам" ладзіць першы беларускі з'езд самвыдату. У мерапрыемстве прымуць удзел прадстаўнікі некалькіх дзясяткаў незарэгістраваных выданняў самага рознага накірунку. Кантакты з арганізатарамі: kds-razam@tut.by, сайт у інтэрнэце: http:razam.by.ru. Паштовая скрыня: 230023, г. Гродна, а/с 237.

ПУБЛІЧНЫ ВАГОН

11-12 студзеня — у памяшканні Цэнтра "Юнацтва" (вул. Фабрыцыуса, 5) адбудзецца фестываль эксперыментальнага мастацтва "Супкультура". У праграме: перфоманс, жывапіс, бодыарт, фота, відэа, музыка. Пачатак асноўнай праграмы ў 18.00. Уваход — з 14.00 СВАБОДНЫ!!!

Падрыхтавала Ірына Слаўнікава, "БМ"

Сяргей Аўсяньнік

На наш Новы 2002

**Сьвяты прывялі Надзею з сабою,
Абяцае зоркі ў чарнаце бясконцай,
Месяц, лядоваю сьціснуты турмою,
Паслухмяна адбіае сьвятло сонца.
Рака, цьмяная й цяжкая — як з олава,
Сталіцу расьцяла лепш ад сталі,
Праўда яскравая, пякучая й голая,
Сыціплей была-б, каб вопратку ня скралі.
У начы прашэпча, улезе — да ўсіх галоў,
Каменьнямі — часу мераю — не заснуць.
Сэрцам Вера дасьць праўдзівых слоў,
Малая і ўпартая, хоць і ледзь пачуць.
Сорамна — Веда схавала твар у далоні —
Праўду баіцца сказаць, што кароль даўно голы.
Гонар напіўся і ўпаў, бачыць белыя коні.
Сорам — у куце хаваецца, ціхі і кволы.
Маўклівыя — вось і Праўда нахабна і зла.
Вера замалая? Што яна ведае? Вучыць чаму?
А легкадумна Надзея заўсёды ў памылкі вяла?..
Надыходзіць Год Новы. Толькі, ці ўдасца яму?**



Фото IREX/ProMedia

У Аргенціне — ужо пяты. А ў Беларусі мала святаў...

"Край": з новымі ідэямі і новым кіраўніцтвам

"Разборкі" рэарганізацыі працягваюцца — нават у тых, хто быў незаўважны ў перадвыбарчай кампаніі, і каму, здавалася б, няма клопату на выніку выбараў. Але з невядомых прычынаў з беларускай незарэгістраванай праварадыкальнай арганізацыі "Край" сышло кіраўніцтва. Вадзім Кабанчук больш не з'яўляецца камандзірам "Краю".

"Зараз, зыходзячы з палітычнай абстаноўкі, якая склалася пасля т.зв. "прэзідэнцкіх выбараў", я, Вадзім Кабанчук, і кола сябраў арганізацыі, палічылі за неабходнае выйсці са складу "КРАЮ", дзеля таго, каб з найбольшай аддачай прыкласці свае намаганні ў іншых накірунках нацыянальнай дзейнасці", — сказаў камандзір і "памахаў ручкаю" сябрам-"краеўцам".

Арганізацыя дзейнасці не спыняе.

У прынцыпе, сам Вадзім ацэньвае вынікі дзейнасці арганізацыі, якой ён кіраваў, досыць станоўча. "Праз арганізацыйныя вышкалы, якія адбываліся ў любую пару года і ў любое надвор'е, прайшлі сотні маладых хлопцаў і дзяўчат. Выдавецтва "Голас КРАЮ" падрыхтавала і выдала дзесяткі нумароў газет, асобных брашур і велізарныя наклады ўлётак. "Краеўскія" нацыяабарончыя акцыі заўсёды праходзілі на высокім узроўні. Нашыя арганізацыйныя шыхты наводзілі жах на ворагаў і ўмацоўвалі рашучасць нашых прыхільнікаў. Вакол дзейнасці арганізацыі пачалі нараджацца міты, якія імкліва распаўсюджваліся ў маладзёвых асяродках па гарадах і мястэчках Беларусі. За тры гады майго кіравання арганізацыяй загартавалася цэлая кагорта мужных і ахвярных беларускіх патрыётаў-нацыяналістаў, якія з годнасцю прымаюць штандар барацьбы за Беларускую Нацыянальную Незалежную Дзяржаву", — адзначае Вадзім Кабанчук. "Краеўцы" працягнуць сваю дзейнасць у тым жа кірунку — вышкалы, выдавецтва гістарычнай літаратуры, даследчыцкая дзейнасць і ўшанаванне памяці беларускіх патрыётаў-незалежнікаў.



Па чутках, Кабанчук плануе застацца ў палітыцы (калі, канешне, дзейнасць "Краю" можна было лічыць палітыкай). Але пакуль невядома, куды прыйдзе былы лідэр спартова-патрыятычнай арганізацыі.

З прыходам новага кіраўніцтва незарэгістраванае СПА "Край" абвесціла і новую ініцыятыву. Яны плануюць стварыць "канферэнцыю нацыяналістычных арганізацыяў". "Настаў час яднання беларускіх нацыяналістаў на глебе нацыянальнай ідэі і канкрэтнага чыну Беларускай Нацыі, да якога заклікаем мы — новая нацыянальная эліта. Мы хочам быць элітай, таму што вырашаць лёсы народаў — прэрагатыва мацнейшых. Мы прагнем стаць мацнейшымі. Мы можам стаць такімі, бо акрамя беларускіх нацыяналістаў у Беларусі няма іншай арганізаванай сілы. Мы не баімся адказнасці. Мы ўжо адказалі на пытанне "чаму?" Засталося знайсці адказ на пытанне "як?" — кажа ўсім патэнцыйна "сваім" "Край".

Сыходзячы з тэксту заявы, канферэнцыя павінна вызначыць агульную ідэалогію беларускага правага руху. Бо, як лічаць заяўляльнікі, усе спробы здабыць незалежнасць і стварыць нармальную беларускую дзяржаву "загінаюся" менавіта з-за адсутнасці ідэалагічнай базы. Па меркаванні новых лідэраў арганізацыі, так было з часоў Каліноўскага і Касцюшкі, так засталося і ў наш час. "Так і не стварыўшы ўласнай ідэалагічнай базы, БНФ раскалоўся пад націскам варожых сілаў і ўнутраных супярэчнасцяў. Захапленне чужымі каштоўнасцямі падарвала падмурак арганізацыі. Калос быў разбураны. Магчыма, ён памёр яшчэ ў 1990 годзе і існаваў толькі за кошт сілы інэрцыі. Нацыянальныя кадры аказаліся ў разгубленасці. Многія пачалі рабіць спробы па стварэнні арганізацыяў, якія б стаялі на пазіцыях беларускага нацыяналізму, а значыць, Народу. Але першыя спробы былі няўдалымі. Сабраць людзей — гэтага мала. Трэба сфармуляваць мэты, закласці прынцыпы і арганізаваць барацьбу", — лічаць краеўцы.

Высновы з заявы: па-першае, "Край" імкнецца ў "актыўную палітыку" і мяркуе стаць новай структурай на беларускім палітычным полі (калі такое, канешне, ёсць). Па-другое, "Край" спрабуе чарговы раз аб'яднаць беларускіх правых у адну, хаця б і каардынуючую, групоўку. Зыходзячы з папярэдняга досведу такіх дзеянняў, гэта будзе надзвычай складана. Цікава, якім чынам здолеюць супрацоўнічаць ізноў-ткі незарэгістраваныя "БПС-1" на чале з Высоцкім і "БПС-2" на чале з невядома кім. Можа, канешне, да канферэнцыі далучыцца "Белы Легіён". І... Здаецца, больш беларускіх правых на Беларусі няма.

А пакуль "Край" займаецца сваімі спрадвечнымі справамі. 25 снежня арганізацыя правяла акцыю па ўшанаванні памяці ідэолага беларускага нацыяналізму, каталіцкага святара Вінцэнта Гадлеўскага. У мерапрыемстве прынялі ўдзел 25 чалавек. Удзельнікі ўшанавання наведалі ўрочышча Благаўшчына ў Трасцянцы, дзе 24 снежня 1942 году фашысцкія акупанты расстралялі Гадлеўскага. На месцы гібелі беларускага нацыяналіста былі запаленыя свечкі і ўскладзеныя кветкі бел-чырвона-белых колераў.

Нагадаем: у снежні 1917-га Гандлеўскі быў сярод тых, хто браў удзел у працы Першага Усебеларускага кангрэсу, а 25 сакавіка 1918 г. — у абвяшчэнні дзяржаўнай незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі. Падчас Другой Сусветнай вайны Гадлеўскі кіраваў Беларускім нацыянальным антыфашыстоўскім супраціўам. Каталіцкая царква, па звестках сябраў "Краю", зараз распачынае падрыхтоўчы працэс па прылічэнні айца Вінцэнта Гадлеўскага да ліку святых.

Сяргей Пульша, "БМ"

Будаўнікі ў Курапатах знайшлі некалькі сотняў старых стрэляных гільзаў

У Курапатах будаўнікі, капаючы катлаван для падземнага пераходу, знайшлі некалькі соцень гільзаў савецкай вытворчасці. Гільзы ляжалі на глыбіні некалькіх метраў пад насыпам блізу ўрочышча.

Тое адбылося ўвечары ў аўторак. Аляксей Капэлан, адзін з "сядзельцаў" у Курапатах, быў сведкам здарэння:

— Я ўжо вярнуўся да намёта, падыходжу да вогнішча, а будаўнікі мне: "Лёха, хадзі сюды". Падыходжу. Мужык падымаецца з адхілу, з катлавану і кажа: "Глядзі". На кавалку цыраты — гільзы. Мы высыпалі іх на пясок, пачалі глядзець. Спрабавалі ачысціць, паглядзець, якога яны году. Яны ў такім стане, развaленыя... Вядома, што не тыдзень, не два таму іх закапалі. Яны знаходзіліся бліжэй да нашага, намётнага боку. Будаўнікі адразу спынілі працу. Пытаюцца: што рабіць?

З аўторка, з часу знаходкі, будаўнікі працавалі на іншым участку дарогі. Каб аднавіць работы ля Курапатаў, ім цяпер неабходна атрымаць заключэнне археолагаў пра паходжанне гэтых гільзаў. А для Аляксея Капэлана паходжанне відавочнае і без археолагаў:

— Гэта ад карабіну нашага... Вось яшчэ адная крупнага калібру... Ёсць зусім маленькая... Яны цалкам іржавыя...

На наступны дзень, у сераду, у Курапаты прыехаў старэйшы навуковы супрацоўнік Інстытуту гісторыі Акадэміі Навук археолаг Алег Іоў. Паводле ягоных словаў, яшчэ нельга дакладна вызначыць паходжанне гэтых гільзаў, але некаторыя папярэднія высновы зрабіць магчыма.

— Тут знойдзеныя сотні дзве гільзаў савецкай вытворчасці. Тыя, што мы паспелі пагядзець, — гэта 1938 і 1949 гадоў. Ёсць буйнакалібравая. Але тут ёсць наганныя гільзы і гільзы ад вінтоўкі. Трэба адабраць гільзы розных калібраў ад рознай зброі, добра іх пачысціць, тады можна будзе рабіць больш пэўныя высновы.

— Вы бачылі гільзы на пагорку, у ямінах. Ці падобныя тыя, ранейшыя, на гэтыя?

— Канешне. Там большасць гільзаў наганныя, бо большасць расстрэлаў праводзіліся з наганаў. А тут большасць вінтовачных гільзаў... Ад першых курапацкіх пахаванняў тут метраў 150, таму мне цяжка зараз сказаць, ці маюць цяпер знойдзеныя гільзы дачыненне да Курапатаў, ці проста, можа, бой нейкі быў. Але ж пра бой тут не было чутно да гэтага часу...

— Ці можа гэтая знаходка нейкім чынам паўплываць на тое, каб прыпыніць будаўнічыя работы ля Курапатаў?

— Вядома, калі б былі знойдзеныя пахаванні, будаўнічыя работы спынілі б і вырашалі, што рабіць далей. Пакуль акрамя гільзаў нічога няма. І не думаю, што тут будуць людскія рэшткі. Бо разумееце, тут нізіна, у ёй не хавалі. Калі толькі выкапаць тут трохметровую яму, як у Курапатах, то яна б адразу была напалову ў вадзе.

Алег Іоў заўважыў сярод гільзаў і датаваныя 1960 годам. Спадар Іоў пакуль не можа патлумачыць, чаму разам апынуліся гільзы 1938, 1941, 1949 і 1960 гадоў вытворчасці. Адна з версій — частка гільзаў магла быць сюды завезеная разам з пяском, калі будавалася Мінская кальцавая дарога. Але больш дакладнае заключэнне аб паходжанні гэтых гільзаў Алег Іоў абяцаў зрабіць праз некалькі дзён, калі дэталёва даследуе знаходкі.

Ганна Соусь, Радыё "Свабода"

ЧАМУ?

Смерць маладога чалавека — выпадак заўжды звышсумны. Гібель сябра падпольнай апазіцыйнай арганізацыі, які знаходзіўся пад наглядам КДБ і скончыў жыццё самагубствам — выпадак экстраардынарны. Самагубства актывіста гомельскага "зубра" Андрэя Зайцава напярэдадні новага году справакавала мас-медыйны рэзананс. Сказана нібыта ўсё — у Інтэрнэце, у газетах, на радыёхвалях... Але мы задаем толькі адно пытанне — чаму ў нашай краіне малады чалавек, заняўшыся палітыкай, не застрахаваны ад жудаснага выніку?

Што да трагічнага фіналу так ці інакш прывяла палітыка, сумневу няма. Канешне, адны сцвярджаюць, што прычынай самагубства 24-гадовага Андрэя Зайцава стаў прэсінг з боку КДБ, іншыя такую версію абвяргаюць... Але відавочна, што калі б не палітыка, якой мінулым летам не займаліся толькі прапаленыя цынікі і махровыя пафігісты, наўрад ці на лёс Зайцава ўзяліся б "уплываць" тыя ж "чэкісты". Наўрад ці напярэдадні выбараў на Андрэя ўзбуджалі б крымінальную справу. Наўрад ці, закрыўшы яе за адсутнасцю доказаў віны, ужо пасля 9 верасня зноў цягнулі б на разборкі, і ўсё ж прысудзілі тры месяцы зняволення. Наўрад ці напярэдадні "ходкі" хлапец тэлефанаваў бы чалавеку, які прадстаўляўся супрацоўнікам КДБ... І запісваў бы стэнаграму, якая потым стала асноўным аргументам яго паплечнікаў.

І з вялікай упэўненасцю можна сказаць — наўрад ці праз чатыры дні пасля той размовы, зафіксаванай і размешчанай зараз у "сеціве", Андрэй вырашыў бы добраахвотна скончыць свой жыццёвы шлях.

Урэшце, ён сказаў усё, што мог. Так, як мог. Як зразумелі?

Далейшыя развагі — са слоў "зуброў", прынамсі тых, хто разумее ці спрабуе зразумець больш за сказанае.

... Лета 2001. У краіне на поўную моц ідзе прэзідэнцкая кампанія. Моладзь, зацікаўленая палітыкай, натоўпамі валіць у шэрагі "Зубра", запаўняючы гарады агітацыяй "Время убирать" і выконваючы шмат іншай працы на карысць дэмакратычнага кандыдата. Сярод актывістаў — і Андрэй Зайцаў, які з'яўляецца камандзірам аднаго з падраздзяленняў руху, заснаванага на класічнай падпольшчыцкай схеме. Пад Андрэевым кіраўніцтвам шаснаццаці-сямнаццацігадовыя валанцёры. Праца кіпіць, рук не хапае...

...Восень. Выбары прайграныя, дзейнасць гомельскага "зубра" на пэўны час запавольваецца і згортваецца. Людзі больш не патрэбныя, бо занядта іх няма чым. І частка актывістаў пераходзіць у ранг тусоўшчыкаў. Такіх, па словах сябраў гомельскай арганізацыі "зуброў", нават сярод "камандзіраў" — блізу трациіны. Аб валанцёрах 16-17 гадоў узросту няма і размовы...

Андрэй таксама з'яўляецца на сходах актывістаў раз на пару тыдняў. Прычым, часам гэтыя з'яўленні прыводзяць да цікавых наступстваў.

Улетку таго скрозь палітычнага года на хлопца паспрабавалі першы раз павесіць "крыміналку". Бацькі непаўнагадовай дзяўчыны, з якой сябраваў Андрэй, падалі заяву ў суд. З заявы вынікала, што сяброўства падпадае "пад артыкул". Але разбіральніцтва скончылася апраўданнем — экспертыза даказала адсутнасць складу злачынства.

Пасля выбараў, калі ў "зуброў" пачаўся "разброд", а ў краіне наступіў перыяд разборак з асабліва "засвечанымі" апазіцыйнымі актывістамі, справу нечакана ўзбудзілі зноў — па заяве "трэцяй асобы". Як патлумачыў прэс-сакратар "Зубра" Алесь Атрошчанкаў, у якасці трэцяй асобы па такой справе можа выступіць практычна хто заўгодна. Але калі Андрэй пасля допыту ў пракуратуры прыйшоў на офіс "зуброў", ён прынёс нечаканую навіну. Па сцвярджэнні Зайцава, у якасці ініцыятара крымінальнага пераследу выступіў... іншы сябра арганізацыі. Таксама Андрэй сцвярджаў, што той "стучыць" на таварышаў, здаючы спісы акцыяў і іхных удзельнікаў.

Справа дайшла нават да бойкі паміж Андрэем і ягоным апанентам. А ашалелыя ад такога павароту сябры руху, прыняўшы ўсё за правакацыю, пайшлі шляхам найменшага ў ёй удзелу і вялікай абачлівасці. Як зараз кажуць самі гомельскія "зубры", "у гэтай сітуацыі абсалютна невядома было, хто з іх кажа праўду, а хто правакатар". Таму разбірацца і не сталі — проста вырашылі пасляць абодвух...

Разбірацца са зноў узбуджанай крымінальнай справай Андрэю давялося ўжо самому. Працэс быў закрытым, і зараз вядомы толькі ягоны вынік — актывісту "Зубра"-ткі "прыпаялі" тэрмін у тры месяцы. Згадзіцеся, і тэрмін дастаткова дзіўны — за такі артыкул мінімальнае пакаранне прадугледжанае ў значна большых памерах.

З новага году Андрэй мусіў пайсці "на зону". Апошнім часам пра ход справы, як і пра ўціск з боку КДБ ён "зубрам" ужо не распавядаў. Пра шантаж і ўціск, магчыма, і ўвогуле не стала б вядома, калі б не запіс тэлефоннай размовы, які за чатыры дні да самагубства Андрэй зрабіў пры дапамозе свайго сябра — старога апазіцыянера. Патэлефанаваўшы чалавеку, якога лічыў сваім ГБшным куратарам, Зайцаў націснуў на запіс — з мэтай зафіксаваць прыклад уціску на апазіцыйных актывістаў. Але тое, што ён пачуў, наўрад ці напоўніла хлопца аптымізмам. Чалавек, які называўся Андрэю супрацоўнікам КДБ Еўсціграевым, канкрэтна і досыць здзекліва даказаў, што ў той сітуацыі, у якую трапіў Андрэй, дапамогі яму больш чакаць няма ад каго — сябры яго "кінулі"...

Самагубства Андрэя, зразумела, выклікала бурную рэакцыю "зуброў". Стэнаграму размовы павесілі на сайце, па Беларусі прайшоў шэраг пікетаў. Паплечнікі па супраціве, чым маглі, дапамаглі сям'і загінулага. Бацька Андрэя, сам стары апазіцыянер, магчыма, падасць заяву па факце давядзення сына да суіцыду. Канкрэтных імёнаў у ёй не будзе...

КДБ рашуча абвергі усялякую віну сваіх супрацоўнікаў і дачыненне да дадзенага інцыдэнту. Далібог, у гэтай краіне любому вядома, што КДБ — не Маленькі Прынц, каб быць адказным нават за тых, каго "прыручае".

Але пранізлівы Экзюперы і вучыў найвялікшай адказнасці не КДБшнікаў. Вучыў людзей — тых, хто навокал нас, і тых, што ў нас... Бо мала падкрэсліць, што Андрэя Зайцава згубіла сітуацыя ўлады, якая вымушае моладзь ісці ў падпольныя арганізацыі, каб дамагацца мірнай змены парадкаў. Сітуацыя краіны, у якой за сур'ёзную грамадзянскую актыўнасць можна займець непрыемнасці і нават "грыманучь на зону".

Яго забілі маўчанне і адзінота. Бо пасля таго, як дзесяткі "зуброў" выкляліся на поўную, змагаючыся за дэмакратыю, ім не знайшлося месца ў паслявыбарным "закансерваваным" палітычным жыцці, і ніхто не пацікавіўся далейшым лёсам "дэмабілізаваных" змагароў. "Мы ў адказе за тых, каго прыручылі"... Хто дасць гарантыі, што сумная гісторыя Зайцава не паўторыцца ў іншым горадзе?..

Праўда, мне кажуць, што зараз актывісты "Зубра" зрабілі для сябе высновы, вядуць актыўную працу сярод сваіх кадраў, каб не дапусціць паўтарэння гомельскай трагедыі. Камандзіры даводзяць новую лінію — імкненне да ўзаемнага даверу і галоснасці. Можа, самі даўмеліся, а можа, адпаведны загад дадзены са "штабоў" — працаваць з "войскам", каб не заседжваліся па "зімніх кватэрах"...

Зноў на штандартах — надзея?

А. Панкратаў, для БМ

Пресс-показ специально для вас

Белорусская независимая пресса в ближайшем времени собирается вновь, уже во второй раз, пофестивалить.



Нынешний Фестиваль независимой прессы обещает быть не менее представительным, чем первый. 18 января в Минск съедутся журналисты примерно 70 изданий со всей Беларуси. Для нас, создателей этих самых "нячэсных" газет, фестиваль — вполне заслуженный праздник. Со всеми его атрибутами: презентациями своих изданий (кстати, по секрету: наша газета этим разом готовит нечто совсем уж несусветное и феерическое. Приходите — сами убедитесь!), веселым капустником, выступлениями-поздравлениями от всяческих известных людей — музыкантов, артистов... И, естественно — с вручением приятных подарков всем, по-хорошему где-либо "засветившимся". В прошлом году в число призеров попала и "Беларуская маладзёжная". Кого отметят нынче, организаторы пока держат в тайне.

Впрочем, о некоторых особенностях II Фестиваля независимой прессы председатель оргкомитета по его проведению, вице-президент Белорусской ассоциации журналистов Эдуард Мельников все-таки поведал:

— Задачи и цели фестиваля остались прежними: снова собраться, осмыслить-проанализировать прошедший период нашей жизни и просто побыть вместе.

За год ситуация с независимой прессой особо не изменилась. На региональном уровне многие газеты подвергались преследованиям, экономическим санкциям. Газет намного больше не стало. Появился "День", зато закрыли "Пагоню".

И когда мы проводили первый фестиваль, и нынче мы не рассчитываем на какой-то четкий фиксированный результат. Это просто профессиональное общение, цель которого — быть в курсе дел друг друга.

Конечно, мы рассчитываем и на активность читателей. Нам интересно будет услышать их мнение о газетах, о публикациях. Потому что для прессы материал — человеческие судьбы, люди, общественные процессы. Поэтому, естественно, встреча руководителей независимых изданий — это и общественное явление.

— Какие издания будут отмечены на фестивале?

— Конкретно "по именам" говорить пока рано. Но уже есть признанные фавориты: "Витебский курьер", "Брестский курьер", "Новая газета Сморгони", "Газета Слонимская", "Интекс-пресс" барановическая. Эти газеты умеют в нынешних жестоких условиях не только оставаться, сохраняться, но и развиваться: у них увеличиваются тиражи, расширяется сфера распространения, появляются свои системы доставки газет читателю. И на уровне менеджмента, и на уровне создания журналистского продукта они очень неплохо выглядят и могут дать фору даже некоторым минским изданиям. Если экстраполировать тираж, скажем, какой-нибудь газеты из-под Барановичей на Минск, то получается очень внушительная цифра.

Вообще я мало знаю некачественных газет среди негосударственных — они делаются профессионалами, а главное — с честным подходом к своей профессии. Я бы в большей степени проблемы независимой прессы отнес на внешние причины. Газеты находятся под прессингом обстоятельств, экономических в первую очередь.

Вопрос еще и в том, что в нашем государстве не существует законодательно обеспеченной процедуры доступа журналиста к информации. Все прекрасно знают, что чиновникам запрещено общаться с журналистами. Попробовали бы в той же Швеции да и в любой другой стране отказать журналисту в информации! В суд попадешь! У нас журналист должен где-то "доставать", выдавливать крохи фактов. Поэтому нередко ошибается, а многого просто не знает. И эта информационная скудость, конечно же, сказывается на содержании газет. Но это большая проблема общества, а не только прессы. Ведь пресса — это зеркало общества, отражение того, что происходит в обществе.

— Кроме зарегистрированных изданий в стране существует и незарегистрированная пресса, самиздат. Иногда на местах влияние самиздат имеет не меньшее, чем "легальные" газеты. На какую-либо помощь, поддержку, хотя бы моральную, от БАЖ эта пресса может рассчитывать?

— Я что-то не припомню случаев, чтобы мы имели контакты с самиздатом... Мое личное мнение: если ты хочешь создавать орган СМИ, то нужно зарегистрироваться, как это ни тяжело. Самиздат — есть самиздат. Вот выходят они по триста экземпляров, и кого поддерживать? Да и не обращались они к нам за помощью...

Готовить фестиваль в этом году БАЖ помогает созданный прошлым летом Фонд развития региональной прессы. Вполне естественное сотрудничество, если учесть, что порядка двух третей участников фестиваля — представители больших и малых провинциальных газет.

Алеся Филипченко, представитель Фонда развития региональной прессы, уверена, что "провинция" не только удивит, но и "поучит жизни" столицу:

— Мы хотим показать, что региональная пресса — это не пустяк, а дело действительно серьезное. Что она, прежде всего, — истинный субъект хозяйствования и может рассчитывать на деловых партнеров. На наш взгляд, фестиваль должен пройти не совсем как политическое мероприятие, а скорее, в форме дружеской встречи, на таком уровне, чтобы потенциальные рекламодатели увидели эти газеты с другой стороны, а не только как "оппозиционеров".

Остается добавить, что мы, журналисты-репортеры-газетчики-издатели-и т.п., очень рассчитываем 18 января в столичном Доме ветеранов увидеть и вас — наших и не только наших читателей. Вместе порадуемся тому, что мы всем врагам назло до сих пор живы. Вместе порассуждаем о наших, ваших — общих проблемах. В конце концов, если пресса — зеркало общества, если ваше, общественное мнение мы отражаем и даже формируем, то, получается, что это и ваш фестиваль тоже.

А. Петровская, "БМ"

Гран-пры для "Пацана"

Кінахіт мінулага выбарчага сэзону "Случай з пацаном" нарэшце атрымаў афіцыйнае прызнаньне. Удзел у першым жа кінафэсьце (які праходзіў у Маскве пад эгідай карпарацыі "Другое кіно") скончыўся атрыманьнем Гран-пры беларускім праэктам.

Фэст "Звышаматарскага кіно" зьяўляецца адным з праэктаў арт-лініі "Другое кіно", зарыентаванай на працу з альтэрнатыўнымі і авангарднымі кінастужкамі. "Звышаматарскі" у дадзеным кантэксьце гучыць не абразьліва — у гэты ж шэраг запісаная нават дэбютная праца "Стачка" знакамітага Эйзэнштэйна. Беларускую каманду прадстаўляла маскоўская частка творчага калектыву — здымачная група ў складзе Сяргея Лобана і Зьміцера Модуля.

Лента зрабіла фурор — водгукі на сайце www.drugoe-kino.ru утрымліваюць такія азначэньні як "беларускі "TRAINSPOTTING" і выказваюць захапленьне палітычнай камэдыяй. Крытыкі "Другога кіно" таксама хваляць ленту і называюць яе адным з найбольш цікавых праэктаў фэстывалю. Вядуцца перамовы аб трансляцыі стужкі на адным з расейскіх тэлеканалаў.

Аб тым, як сустрэлі ў Менску трыюмф фільма ягоныя стваральнікі — мастацкі калектыў газэты "Навінкі" — і аб далейшых творчых плянах распавядаюць натхняльнікі праэкту Лёлік Ушкін (Л.У.) і Паўлюк Канавальчык (П.К.).

Л.У.: — Так, наш фільм узяў Гран-пры на фэсьце звышаматарскіх фільмаў, у якім удзельнічаюць усе маладыя праэкты СНД. Мы самі не штурхалі стужку туды — напярэдадні нашыя сябры Лобан і Модуль атрымалі нейкі прыз на маскоўскім фэсьце відэапраэктаў, і арганізатары зацікавіліся іх новай працай — нашым сумесным праэктам. З "Навінак" ніхто ня езьдзіў у Маскву, прыз атрымліваў Сяргей Лобан. Для нас больш істотна тое, што стужцы як пераможцы прапанавалі бясплатнае тыражаваньне ў Расеі і распаўсюд па сетцы альтэрнатыўных фільмаў, якая ахоплівае СНД.

П.К.: — Да гэтага здарэньня мы аднесьліся, як да належнага. Наш фільм ня мог не заняць якое-небудзь месца, тым больш ня ўзяць Гран-пры! Яшчэ больш прыемна, што ў гэтым фэсьце ўдзельнічаў фільм знакамітага Эйзэнштэйна "Стачка". Я нагадаю, што славуты рэжысэр — аўтар "Браненосца Потемкина". І ягоная "Стачка" саступіла нашаму шэдэўру! Таму можна сказаць, што падрастае новае пакаленьне Эйзэнштэйнаў, якія ў стане рабіць шэдэўры і выбітныя стужкі.

А што тычыць наступных плянаў, то, безумоўна, я лічу, наш фільм не аднойчы засьвеціцца на міжнародных фэстах дзе-небудзь. Зараз наступае сэзон фэстаў у Польшчы, Чэхіі, Нямеччыне. Мы ня будзем нікуды шчыміцца, але нас проста просяць паставіць нашу касэту ў конкурсныя прагляды...

— А якія пляны ў здымачнай групы далей? Ці зьявіцца "Пацан-2"?

Л.У.: — Зараз мы ў пошуку, але посьпех першай стужкі натхняе. Сцэнару новага фільма пакуль няма, але задумка ёсьць. Гэта будзе нешта зьвязанае з праблемамі аграрнага сэктару... Мы запрашаем усіх зацікаўленых зьвязвацца з "Навінкамі" і прапаноўваць свае праэкты, таму што мы паралельна зьбіраемся заняцца выпускам кароткамэтражак. Не тое, каб рэдакцыя "Навінак" ператваралася ў кінастудыю, але ў нашай газэце кожны займаецца тым, што яму падабаецца, а ўсе астатнія дапамагаюць.

П.К.: — Не аб праблемах аграрнага сэктару, а аб агульных праблемах, якія стаяць перад нашай краінай на дадзеным гістарычным этапе. Гэта ня будзе "Случай з пацаном-2", канешне, будуць у нечым адрозьненьні. Мы паспрабуем новы жанр. Магчыма, баявік, магчыма, "ужастык", магчыма, трылер, магчыма, усё разам. З элемэнтамі камэдыі, эротыкі і рукапашнага бою.

Наконт грошай на ўсё гэта, канешне, — іньшае пытаньне. Галоўны разьлік — на прызавы фонд, які адграбе наш фільм на наступных фэстах. І, я думаю, грошай хопіць на тое, каб зьняць не адну поўнамэтражную карціну. На поўны галівудзкі фармат. Кароткамэтражкі, "Фіцілі" — таксама адзін з праэктаў. Але, на жаль, гэта хутчэй тэлевізыйны фармат, а шчыльнага выхаду на эфір мы пакуль ня маем. Іх калі рабіць, то ўсё адно толькі на нарэзку відэакасэтную. Таму мы будзем усё-ткі спачатку арыентавацца на поўны мэтраж.

— Ці было нейкае сьвяткаваньне ў Менску з нагоды посьпеху ў Маскве?

П.К.: — У прынцыпе, усім вядома, што народныя сьвяткаваньні ў рэдакцыі газэты "Навінкі" адбываюцца пэрманэнтна, і таму зьвестка аб перамозе нашага фільму на фэсьце не застала нас зьнянацку. Мы здолелі належным чынам адзначыць такую падзею!

Распытваў Sanitar,
для "БМ"

(захаваны правапіс арыгіналу)

Ствараецца Рэгіянальны маладзёжны ПАРЛАМЕНТ

У хуткім часе ў Беларусі магчымае з'яўленне Рэгіянальнага маладзёжнага парламента. Пытанне аб яго стварэнні было абмеркаванае 7 студзеня ў Смаргоні на І Рэгіянальным з'ездзе маладзёжных дэмакратычных арганізацый і інцыятываў Смаргонскага, Ашмянскага і Астравецкага раёнаў. На з'ездзе прысутнічалі лідэры і актывісты 12-ці маладзёжных арганізацый.

Неабходнасць стварэння падобнай структуры ўдзельнікі тлумачаць неэфектыўнасцю існуючых на дадзены момант кааліцыяў. Плануецца, што будзе распрацаваная працэдура па выбарах дэпутатаў ды дзейнасці падобнага парламента. Па словах аднаго з арганізатараў з'езда Пятра Явідовіча, у рэгіянальным маладзёжным парламенце будуць працаваць камісіі па справах моладзі, па сацыяльных пытаннях ды іншыя, якія будуць выходзіць з прапановамі да ўладаў. "Гэта дазволіць нам вырашаць існуючыя праблемы. Паасобку арганізацыям цяжка гэта зрабіць, а разам будзе зрабіць лягчэй," — упэўнены сп. Явідовіч. Ужо існуе ініцыятыўная група па правядзенні канферэнцыі, падчас якой будзе больш дакладна абмеркаванае стварэнне Рэгіянальнага маладзёжнага парламента. Мяркуецца, што з часам падобны парламент распаўсюдзіць сваю дзейнасць на ўсю Беларусь.

На з'ездзе была таксама зацверджаная праграма дзейнасці маладзёжных дэмакратычных арганізацый і інцыятываў на 2002 год. Праграма прадугледжвае шырокую кампанію грамадзянскай актывізацыі моладзі, вырашэнне мясцовых праблемаў, высоўванне маладых дэмакратычных лідэраў і ўдзел маладзёжных арганізацый у маючых адбыцца выбарах. Таксама была створана адзіная рэгіянальная каардынацыйная структура на аснове кааліцыі "Маладзёжны дэмакратычны рух" (Смаргонь), інфармацыйна-тэхнічнага цэнтра "Рэгіён" (Ашмяны) і маладзёжнага грамадскага аб'яднання "Віленскі шлях" (Астравец).

